# XXIV Міжнародны спецыялізаваны форум па тэлекамунікацыях, інфармацыйных і банкаўскіх тэхналогіях "ТІБО-2017»

З 18 па 21 красавіка 2017 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі сумесна з зацікаўленымі праводзіць XXIV Міжнародны спецыялізаваны форум па тэлекамунікацыях, інфармацыйных і банкаўскіх тэхналогіях ТІБО-2017;.

Форум ТІБО праводзіцца з 1994 года і з'яўляецца адным з найбуйнейшых выставачных мерапрыемстваў па гэтай тэматыцы ў краінах СНД і Балтыі. Форум штогод прыцягвае ўвагу вядучых беларускіх і замежных вытворцаў тэлекамунікацыйнага абсталявання, кампутараў і праграмнага забеспячэння, сродкаў і сістэм бяспекі, пастаўшчыкоў разнастайных ІКТ-паслуг.

У выставе ТІБО-2016 прынялі ўдзел больш за 100 кампаній з 18 краін свету (Беларусь, Расія, Украіна, Казахстан, Азербайджан, Літва, Латвія, Польшча, Чэхія, Германія, Фінляндыя, Швецыя, Вялікабрытанія, Турцыя, Кітай, Паўднёвая Карэя, Японія, ЗША).

Праграма Беларускага кангрэса па тэхналогіях інфармацыйнага грамадства была насычанай і ўключала 25 дзелавых мерапрыемстваў : форумы, канферэнцыі, круглыя сталы, семінары-прэзентацыі. У рабоце кангрэса прынялі ўдзел спецыялісты з 6 краін свету (Беларусь, Расія, Украіна, Казахстан, Азербайджан, ЗША).

Традыцыйна ўзнагароджанне пераможцаў конкурсу; Інтэрнэт-прэмія ТІБО-2016 , на які было пададзена 275 заявак па 12 намінацыях .

У рамках форуму ТІБО-2016 быў арганізаваны ІІ Дзіцяча-юнацкі фестываль Робадром . У спаборніцтвах мабільных робатаў у катэгорыях Кегельрынг-М ; Кегельрынг-З прынялі ўдзел 52 каманды з Мінска і Гомеля .

Асвятленне мерапрыемстваў форуму ў беларускіх і замежных сродках масавай інфармацыі забяспечвалі 6 інфармацыйных партнёраў

Запрашем прыняць удзел у XXIV Міжнародным спецыялізаваным форуме па тэлекамунікацыях, інфармацыйных і банкаўскіх тэхналогіях ТІБО-2017

Кантактная асоба : Караткевіч Павел Міхайлавіч, тэл.: +375 (17) 306-06-06, факс: +375 (17) 203-33-86, e-mail: tibo@tc.by

Інфармацыю аб мерапрыемствах Форуму можна атрымаць на сайце арганізатара ЗАТ «Тэхніка і камунікацыі», афіцыйных старонках у Facebook і " ВКонтакте ".

**Source URL:** *https://www.mpt.gov.by/xxiv-mizhnarodny-specyyalizavany-forum-pa-telekamunikacyyah-infarmacyynyh-i-bankauskih-tehnalogiyah*